**УДК 94(476) “16/18”:393**

# ЭТАС ШЛЯХЦІЦА І ШЛЯХЦЯНКІ Ў ПАХАВАЛЬНЫХ КАЗАННЯХ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ XVI – XVIII стст.

***канд. гіст. навук, Н.В. СТАХНО***
***(Ліцэй Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, Мінск)***

*У артыкуле робіцца спроба рэканструкцыі этасаў шляхціца і шляхцянкі, якія фарміраваліся хрысціянскімі прапаведнікамі на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у эпоху барока. Рэканструкцыя адбываецца на аснове аналізу пахавальных казанняў, якія набылі надзвычайную папулярнасць у азначаны перыяд. Адзначаюцца тыя маральна-этычныя эталоны шляхціца-мужчыны і жанчыны-шляхцянкі, якія фарміраваліся на іх аснове, праводзіцца параўнанне вобразаў шляхціца-католіка і шляхціца-пратэстанта, высвятляюцца канфесійныя асаблівасці этасаў. Акрамя таго, выбудоўваецца іерархія каштоўнасцей, якія трансляваліся царквой як годныя для ўспрыняцця. Высвятляюцца асаблівасці каштоўнаснай іерархіі шляхціца ў суаднясенні яго з вобразам шляхцянкі. Складаецца сістэма роляў, характэрных для прывілеяванага слою насельніцтва Рэчы Паспалітай.*

***Ключавыя словы:*** *шляхецкая культура, танаталогія, этас, Рэч Паспалітая, пахавальныя казанні XVI – XVIII стст.*

**Уводзіны.** Эпоха барока праходзіла пад знакам Контррэфармацыі, калі асаблівую ролю адыгрывала каталіцкая царква, якая імкнулася максімальна кантраляваць усе сферы жыццядзейнасці чалавека. Для гэтага яна выкарыстоўвала самы галоўны страх – страх смерці і вечных пакут пасля яе. У рэлігійнай літаратуры паўсюдна ўзнікае сцвярджэнне, што толькі той, хто добра жыве, той і добра памрэ. Напрыклад, святар А. Ларэнцовіч ў сваіх казаннях транслiраваў ідэю, што павінна быць прапорцыя смерці і жыцця – Бог не дае добрай смерці таму, хто не купіў яе цягам зямнога існавання[1]. Для засваення мастацтва добрага жыцця, прапаведнікі лічылі, што хрысціянін павінен быў выпрацаваць для сябе мадэлі паводзін у разнастайных сітуацыях, якія ён будзе стала прайграваць і, такім чынам, фарміраваць у сабе пэўныя паводзінскія навыкі [1, с. 93]. Праз шматлікія пропаведзі, пахавальныя казанні і рэлігійную літаратуру царквой трансляваўся адпаведны этас шляхціца. Этас – гэта сукупнасць ідэальных уяўленняў, этычных норм, якія выражаюцца ў вызначаным стыле жыцця; гэта ўзгодненыя правілы і ўзоры жыццёвых паводзін [2, с. 105].

*Мэтай* дадзенага артыкула з’яўляецца рэканструкцыя этасаў шляхціца і шляхцянкі і вызначэнне ўплыву на іх фарміраванне хрысціянскай царквы на тэрыторыі Рэчы Паспалітай у эпоху барока. Для дасягнення дадзенай мэты мы спачатку высветлім гісторыю ўзнікнення пахавальных казанняў і іх развіцця на нашай тэрыторыі, а затым на іх аснове ахарактарызуем тыя маральна-этычныя эталоны шляхціца-мужчыны і жанчыны-шляхцянкі, якія яны фарміравалі.

Перш за ўсё неабходна адзначыць дастаткова нізкую распрацаванасць дадзенай праблематыкі ў сучаснай гістарычнай навуцы. Панегірычная літаратура і пахавальныя казанні ў асноўным даследаваліся літаратуразнаўцамі[2] і толькі ў апошні час да іх звярнуліся як да крыніц, з дапамогай якіх раннемадэрновыя святары імкнуліся фарміраваць светапогляд тагачасных людзей. Першым такую спробу зрабіў польскі гісторык Марцэлі Косман [3]. Сёння азначанае пытанне падымаецца ў працах расійскіх гісторыкаў Маргарыты Карзо [1] і Марыі Лескінэн [2], а таксама беларускай даследчыцы Наталлі Сліж [4–6].

**Асноўная частка.** Што тычыцца гісторыі ўзнікнення пахавальных казанняў, то першыя з іх з’явіліся ў старажытнай Грэцыі[3]. Заўважалі, што менавіта казанне становіцца найвялікшым падарункам, які жывыя могуць зрабіць памерламу; дзякуючы яму памерлы назаўсёды застаецца ў памяці. На тэрыторыі Польшчы першапачаткова казанні былі лацінамоўнымі і прысвячаліся манаршым асобам. Самае ранняе казанне было зроблена Станіславам са Скарбімера з нагоды смерці каралевы Ядзвігі і пабачыла свет у 1399 г. Першы твор падобнага кшталту ў Вялікім Княстве Літоўскім стварыў пратэстанцкі святар Цыпрыян Базылік у гонар смерці Альжбэты з Шыдлоўскіх Радзівіл у 1562 г. З канца XVI ст. рэзка пашыраецца кола людзей, якім прысвячаліся пахавальныя казанні, зараз гэта былі не толькі каралі і найвыдатнейшыя дзеячы дзяржавы, але жанчыны, дзеці, шляхціцы, царкоўныя дзеячы, нават мяшчане і купцы сталі фігурантамі гэтага кшталту твораў[4]. Надзвычайны рост колькасці прамоваў у азначаны перыяд быў звязаны з павелічэннем публічнай дзейнасці святароў – яны сталі актыўнымі ўдзельнікамі соймавых пасяджэнняў, свят і г.д.[5]. Акрамя таго, пашырэнню выкарыстання пахавальных казанняў спрыяла контррэфармацыйная

[1] Lorencowicz, A. Kazania na Niedziele całego roku : w 2 cz. / A. Lorencowicz. – Kalisz : Druk. Kolegium Kaliskiego Soc. Jesu, 1671. – Cz. 1. – S. 118.
[2] Platt, D. Kazania pogrzebowe z przełomu XVI–XVII w. Z dziejów prozy staropolskiej / D. Platt. — Wrocław : Ossolineum, 1992. – 183 s. Skwara, M. Polskie drukowane oracje pogrzebowe XVII wieku. Bibliografia / M. Skwara. – Gdańsk : Słowo/obraz terytoria, 2010. – 732 s. Nowicka-Jeżowa, A. Pieśni czasu śmierci : studium z historii duchowości XVI–XVIII wieku / A. Nowicka-Jeżowa. – Lublin : Towarzystwo Nauk. Katolickiego Uniw. Lubelskiego, 1992. – 478 s.
[3] Platt, D. Kazania pogrzebowe z przełomu XVI–XVII w. Z dziejów prozy staropolskiej / D. Platt. – Wrocław : Ossolineum, 1992. – S. 6.
[4] Santhoff, K. Łzy smutne, na pogrzeb slawney pamięci Paniey Elzbiety Winklerowey ... / K. Santhoff. – Poznań : Druk. J. Wolrabá, 1616. – [14] s.
[5] Platt, D. Kazania pogrzebowe z przełomu XVI–XVII w. Z dziejów prozy staropolskiej / D. Platt. – Wrocław : Ossolineum, 1992. – S. 25.

дзейнасць касцёла як інстытуцыі, якая стварала грамадскія вобразы паводзін. Касцёл дамагаўся ад ксяндзоў, каб прамовы на пахаваннях стваралі ўзоры, годныя пераймання, а не проста ўсхвалялі канкрэтных людзей.

Аб запатрабаванасці такога кшталту тэкстаў у паўсядзённым жыцці сведчыць перавыданне некаторых твораў, нават неаднаразовае (напрыклад, перавыданне кніг П. Скаргі). Польскі гісторык літаратуры Ганна Дзяхціньска высветліла, што 13% літаратуры ў Каралеўстве Польскім і Вялікім Княстве Літоўскім у XVI ст. складала літаратура, створаная з нагоды нейкай падзеі (прамовы на каранацыі, хрысцінах, вяселлі, пахаванні і г.д.), а ў XVII ст. яна складае ўжо 30%[6]. Самым багатым на выданні пахавальных казанняў быў перыяд з 1632 па 1654 гг., калі ў свет выходзілі па 10 кніг на год, а ў 1638 г. было выдадзена ажно 20 твораў. Потым пачынаецца сумна вядомы «Патоп» і колькасць выданняў рэзка змяншаецца[7].

Першыя казанні, створаныя ў Рэчы Паспалітай, былі вельмі разнастайнымі і не падпарадкоўваліся нейкаму абразцу, але Пётрыкаўскі сінод 1607 г. прыняў рашэнне, каб памеры казанняў былі невялікімі, а сінод Віленскай дыяцэзіі 1669 г. пастанавіў не зацягваць прамовы больш чым на гадзіну і не дапускаць у іх панегірычных элементаў, а канцэнтравацца выключна на набожных павучэннях [3, с. 253]. Такі падыход быў сфармуляваны і пратэстантамі ў XVI ст. Так, М. Лютар вучыў, што трэба рабіць націск не на ўсхваленне памерлага, а на суцяшэнне і навучанне прысутных, а таксама ўсхваленне Бога. Асноўная розніца паміж каталіцкімі і пратэстанцкімі казаннямі ў азначаны перыяд палягала менавіта ва ўвазе да асобы памерлага – у першых ёй прызначаецца нашмат больш месца, у той час як у апошніх значна больш увагі надаецца дактрыне.

У XVII ст. замацавалася схема для пахавальных казанняў ва ўсёй Еўропе, і розныя хрысціянскія канфесіі цалкам ці часткова яе ўспрынялі[8]. Яна ўключала тытульную старонку з назвай, каму твор прысвечаны (яго грамадскія функцыі, пасады), імя і прозвішча стваральніка, месца агалашэння, а таксама месца і час выдання. На адваротным баку змяшчалася выява герба і невялікі твор у яго гонар; на наступнай старонцы прысутнічала прысвячэнне, а потым распачыналася само казанне з так званага «вота» – выказвання на лацінскай ці польскай мове са Старога ці Новага запаветаў, якое чырвонай лініяй пралягала праз увесь твор. Пахвала чалавеку звычайна складалася з некалькіх частак. Класічная схема з трох раздзелаў была запазычана ў старажытнарымскага рытара Квінтыліяна, які выдзяляў наступныя часткі: перад нараджэннем, жыццё і пасля смерці. То бок, меркавалася апісанне велічы роду да якога належаў памерлы, далей апісвалася яго жыццё і падкрэсліваліся лепшыя яго рысы, а скончвалася ўсё смерцю і тым вобразам, які памерлы пакінуў у нашчадкаў[9].

Такім чынам, казанні, якія нарадзіліся як падарунак памерламу ў старажытнай Грэцыі пераўтварыліся на рэтраслятара ідэальных вобразаў у контррэфармацыйныя часы.

Якія ж вобразы намагалася сфарміраваць праз пахавальныя казанні і пропаведзі царква?

Перш за ўсё, самай галоўнай і неад'емнай рысай, што было лагічна для казанняў зробленых святарамі, была набожнасць. Яна прысутнічае як у каталіцкіх, так і пратэстантскіх творах. Так, напрыклад, сярод галоўных цнот у эпітафіі Віленскага ваяводы і Гетмана вялікага літоўскага Казіміра Яна Сапегі (пам.1720) адзначаецца набожнасць[10]. Пад час пахавання знакамітага канцлера Льва Сапегі (пам. 1633), езуіт Себасцьян Лайшчэўскі на першы план паставіў палкую набожнасць, удзячнасць Богу, а таксама малітвы нябожчыка за ўзвышэнне каталіцкай царквы, выкараненне ерасі і, асабліва, за настаўленне на сапраўдны шлях усіх заблудлых душ [3, с. 276]. На пахаванні галоўнага трыўмфатара хоцінскай бітвы, гетмана Яна Караля Хадкевіча (пам. 1621) было зроблена некалькі прамоў, але ў кожнай з іх падкрэслівалася яго рэлігійнасць. Так, Ф. Біркоўскі выхваляў разуменне Я. Хадкевіча, што ўсім перамогам ён абавязаны не сабе, а вышэйшым сілам, таму перад кожнай бітвай гетман доўга маліўся, а пасля перамогі – шчыра дзякаваў Богу [3, с. 283]. Таксама і Б. Чарлінскі адзначыў, што вера знакамітага вайсковага правадыра праяўлялася ў частых споведзях, сталай прысутнасці духаўніка і раздачы міласціны[11]. Сымон Высоцкі, у казанні зробленым на пахаванні Яна Сімяона Алелькавіча (пам. 1592), звярнуў асаблівую ўвагу на яго пераход – яго продкі былі праваслаўнымі, а ён абраў каталіцкую веру. Дадзены крок вельмі высока ацэньваўся каталіцкімі святарамі. Калі князь перайшоў у «сапраўдную» веру, то стаў яе палымяным абаронцам і рабіў усё для яе пашырэння[12].

Некаторыя аўтары не проста адзначалі набожнасць памерлага, але засяроджвалі ўвагу спачатку слухачоў, а потым і чытачоў на рэлігійных практыках, у якіх гэтая набожнасць праяўлялася. Так, усхваляліся асабістыя намаганні Паўла Любартавіча Сангушкі (пам. 1750), якія ўвасабляліся ў трыманні суботняга паста, наведванні

[6] Dziechcińska, H. Z dziejów życia literackiego w Polsce XVI i XVII wieku / H. Dziechcińska. – Wrocław : Wyd. PAN, 1980. – S. 23, 36.

[7] Skwara, M. Polskie drukowane oracje pogrzebowe XVII wieku. Bibliografia / M. Skwara. – Gdańsk : Słowo/obraz terytoria, 2010. – S. 64.

[8] Там жа – S. 67.

[9] Там жа – S. 47.

[10] Biblioteka Ordynacji Zamojskiej – Dzial 814. – Dziennik Jana Stanisława Jabłonowskiego wojewody ruskiego 1718–1725. – Ark. 58obr.

[11] Czarliński, B. Kazanie na pogrzebie jaśnie wielmożnego pana Jana Karola Chodkiewicza, Hrabie ze Szkłowa i Myszy, na Bychowie, Wojewody Wileńskiego, Korony Polskiej przeciw Osman Sułtanowi, a W. X. L., Hetmana Najwyższego, Gubernatora Ziemie Inflantskiej, Derpskiego, Luboszańskiego, Wielońskiego etc. etc. Starosty. Miane w Ostrogu w Kościele Farskim / B. Czarliński. – Wilno : Druk. Akademicka, 1622. – Ark. 28.

[12] Wysocki, S. Kazanie na pogrzebie Jasnie Oświeconego Książęcia je[go] x[iążęcej] m[ości] pana Jana Symeona Olelkowicza z łaski Bożey Książęcia Słuckiego y Kopylskiego etc. Ostatecznego męskiey płci tey zacney y staradawney familiey potomka. Miane przez x[iędza] S. Wysockiego, Soc. Jesu kaplana w kościele teyże Soc. w Lublinie / S. Wysocki. – Wilnia : Druk. Akádemiey Soc. Jesu, 1593. – Ark. 26.

шматлікіх набажэнстваў. Больш таго, ён паўсюль вазіў з сабой тастамент, перачытваў яго і папраўляў, а калі зразумеў, што набліжаецца да смерці, пачаў спавядацца двойчы на дзень. Князь быў слынны сваёй харытатыўнай дзейнасцю: у вялікі чацвер амываў ногі ўбогім, пасля чаго раздаваў ім кашулі і накрываў для іх сталы і абслугоўваў іх разам з жонкай[13]. У казанні на гадавіну смерці Яна Альбрыхта Радзівіла (пам. 1626), бернардзінец А. Львавецыуш падкрэсліваў набожнасць князя, якая выяўлялася ў дараванні ялмужны, пелігрымках, частых споведзях, будаўніцтве касцёлаў. Прамоўца падкрэсліваў рэлігійнасць асаблівымі адносінамі нябожчыка да св. Францыска, труну якога ён наведаў у Асізіі[14]. Нават ва ўспрыняцці смерці князь паводзіў сябе як сапраўдны хрысціянін, ён не супраціўляўся, а наадварот успрымаў яе як праваднiка да нябеснай хвалы[15]. У панегірыку Яна Альфонса Ляцкага (пам. 1647) адзначалася, што ён скідаў клункі грахоў сваіх, часта спавядаючыся; спусташаў цяжкія каліты, міласціну раздаючы; скідаў каваныя боты з ног сваіх, зняможваў цела сваё пастамі, валасяніцамі, пакутамі, часта ажыццяўляў падарожжы да святых мясцін [3, с. 277–278].

У пратэстанцкіх казаннях знаходзім падобныя абароты, прысвечаныя рэлігійнасці памерлых. Так, у казанні Адама Рауса, прысвечаным смерці Януша Радзівіла (пам. 1620), найважнейшай вызначалася набожнасць князя: першая з усіх цнотаў – набожнасць кальвінісцкая, без якой усе астанія цноты – ні што іншае, як атрута. Падкрэслівалася талерантнасць, а таксама барацьба за роўнасць усіх веравызнанняў у Рэчы Паспалітай[16]. Малады пратэстант Дадзібуг Уладыслаў Слушка (пам. 1630), нягледзячы на ўзрост, быў надзвычайна набожным, ён прытрымліваўся пастоў, шмат маліўся, раздаваў ялмужну, добра ставіўся да бедных[17].

Яшчэ адной праявай глыбокай рэлігійнасці чалавека лічылася пастаянная падрыхтаванасць да смерці. Такі навык засвоіў Крыштаф Мікалай Сапега (пам. 1631), які казаў, што яму сёння памерці, як і заўтра, так і праз 60 гадоў – не страшна, бо ён смерць заўсёды чакае і мае надзею на Бога, што яго тая пані гатовага знойдзе, калі прыйдзе[18].

Наступная рыса, непасрэдна звязаная з набожнасцю, ці нават адна з яе праяў, – гэта мецэнацкая дзейнасць, якая ўключала фундаванне цэркваў, касцёлаў, кляштараў, утрыманне шпіталяў і навучальных устаноў, перадачу рэчаў царкве. Князь Ян Сімяон Алелькавіч (пам. 1592) вызначаўся шчодрасцю: ён выдаткоўваў вялікія грашовыя ахвяраванні на ўтрыманне касцёлаў, а таксама быў адным з фундатараў Люблінскага езуіцкага калегіума[19]. Ліпскі прафесар Матэўш Дрэссэр у творы, прысвечаным князю Крыштафу Радзівілу Пяруну (пам. 1603), дзякаваў за тую дапамогу, якую ён аказваў акадэміі[20]. Фрыдэрык Старцкіус усхваляў дапамогу Крыштафа Радзівіла (пам. 1640) у развіцці пратэстанцкай адукацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім. Акрамя таго, ён фундаваў новыя зборы, а таксама ініцыяваў новае выданне Бібліі[21]. Падканцлер Павел Стэфан Сапега (пам. 1635) праяўляў сваю набожнасць праз фундаванне касцёлаў, кляштараў, утрыманне шпіталяў. Марэк Карона, які рабіў прамову на яго пахаванні, адзначаў, што памерлы яшчэ ў маладосці дзесьці прачытаў павучэнні св. Гераніма, што матэрыяльныя дзеянні ў дачыненні да касцёла не прыносяць плёну, калі яны не падмацаваны малітвамі. Па гэтай прычыне, Павел Сапега асаблівую ўвагу прыдаваў малітвам і наведваў набажэнствы[22].

Адной з галоўных канцэпцый каталіцкай царквы раннемадэрновай эпохі ў Рэчы Паспалітай быў не проста набожны хрысціянін, які выконвае ўсе запаветы і сваёй фундатарскай дзейнасцю намагаецца замацаваць вядучую пазіцыю сваёй царквы ў грамадстве, але вобраз актыўнага рыцара-сармата, які змагаецца за сапраўднага Бога з мячом у руках. Рэч Паспалітая знаходзілася ў атачэнні «ворагаў» сапраўднай веры – на ўсходзе былі схізматыкі, на поўначы – пратэстанты, на поўдні – мусульмане. Усе яны актыўна ўмешваліся ў палітычнае і рэлігійнае жыццё краіны. Таму, сапраўдны шляхціц мусіў абараняць незалежнасць сваёй Айчызны, а разам з ёй – і чысціню веры,

[13] Wołłowicz, A. Droga Do Niesmiertelnosci, Publicznych Cnot torem [...] Xiążęcia JMCI Pawla Karola [...] Lubartowicza Sanguszka, [...] Znaczna : Przy Pogrzebowym Akcie w Kościele Lubelskim WW. OO. Kapucynow, wszystkim do naśladowania Pokazana / A. Wołłowicz. – Lublin : Druk. Jezuitów, 1751. – Ark. 24.

[14] Lwowecjusz, A. Kazanie na rocznicy iaśnie oświecone[g]o pana ie[g]o mości p. Iana Albrechta Radziwiła, książęcia Państwa Rzymskie[g]o z Ołyki, Nieświeża, na Klecku etc. etc. miane w kościele kleckim dnia 15 kwietnia roku 1627 / A. Lwowecjusz. – Wilno : Druk. Akademicka, 1627. – Ark. E – E1.

[15] Там жа. – Ark. E1obr. – E2.

[16] Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy : funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice : Wyd. uniw. Śląskiego, 2012. – S. 44.

[17] Adrianowic, W. Kazanie Na Pogrzebie Wysoce Urodzonego wielkiey nádzieie Młodzieniaszkà, Ięgo [sic] Mosci P. Dadziboga Władysława Słuszki Kasztellanica Zmudzkiego, Stàrośćicà Rzeczyckiego, Pàcholęćiá Pokoiowego, Krolewicà lego Mći. Naiàśnieyszego Wlàdysławà Zygmunta obránego Cára Moskiewskiego. Miánè W Kościele Kàznodzieyskim [sic, winno być: w Kościele Kowalewskim] die 3. Lipcà. Roku Páńskiego. 1631 [sic, zamiast: 1630] / W. Adrianowic. – Lwow: [s/e], [1630]. – Ark. D3–D4.

[18] Olszewski, J. Grono winne pod zodyakiem Sapieżyńskim w młodem wieku doyrzałey cnoty na pogrzebie [...] Krysztofa Sapiehi woiewodzica wileńskiego [...] w kościele S. Michała panien zakonnych s. Klary [...] 27 Nouemb. [...] 1631 / J. Olszewski. – Wilno : Druk. Akademicka, 1632. – Ark. L4 obr.

[19] Wysocki, S. Kazanie na pogrzebie Jasnie Oświeconego Książęcia je[go] x[iążęcej] m[ości] pana Jana Symeona Olelkowicza z łaski Bożey Książęcia Słuckiego y Kopylskiego etc. Ostatecznego męskiey płci tey zacney y staradawney familiey potomka. Miane przez x[iędza] S. Wysockiego, Soc. Jesu kaplana w kościele teyże Soc. w Lublinie / S. Wysocki. – Wilnia : Druk. Akádemiey Soc. Jesu, 1593. – Ark. 26.

[20] Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy : funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice : Wyd. uniw. Śląskiego, 2012. – S. 27.

[21] Там жа. – S. 66.

[22] Korona, M. Krzyz strzalisty oświeconego domostwa ich mościow pp. Sapiehow abo kazanie żałobne przy pogrzebaniu ciała jasnie wielmożnego pana i. m. p. Pawła Sapiehi [...] odprawione w Holszanskim kosciele Oycow Franciszkanow / M. Korona. – Wilno : Druk. Akademicka, 1637. – Ark. D – D3obr.

бо Рэч Паспалітая была апошнім фарпостам каталіцызма ў Еўропе. Па гэтай прычыне, вельмі важным з'яўлялася вайсковая дзейнасць шляхціца. Дадзеная канцэпцыя мела даволі доўгую гісторыю, якая пачалася яшчэ з ранехрысціянскіх абшчын і ўзмацнілася ў перыяд сярэднявечных крыжовых паходаў. Другое жыццё яна атрымала ў перыяд Контррэфармацыі. Місіянерства польскай сарматыі вызначалася абарончай пазіцыяй, наўзамен экспансіяніcцкай традыцыі Сярэднявечча.

У якасці прыкладаў да ўспадкавання фігуравалі ў першую чаргу гетманы, якія атрымалі значныя перамогі. Б. Чарлінскі адзначаў, што Ян Караль Хадкевіч (пам. 1621) быў не толькі вядомы ўсёй Еўропе за свае ратныя подзвігі, меў талент ваеннага стратэга, але і ўкладаў уласныя сродкі ў фінансаванне войскаў у паходзе супраць туркаў[23]. Крыштаф Радзівіл Пярун (пам. 1603) у эпітафіі, складзенай С. Рысінскім, замацоўваецца ў памяці наступных генерацый у вобразе дарагога Айчызне пагромцы ворагаў[24]. Яго нашчадак Крыштаф Радзівіл (пам. 1640) увогуле характарызуецца як ідэальны гетман, які заўсёды быў цвярозым, мужным, удзельнічаў у бітвах, рызыкуючы ўласным жыццём побач са звычайнымі жаўнерамі, нават не зважаючы на заўвагі караля, заўсёды быў гатовы выслухаць парады сваіх падначаленых і лічыў іх роўнымі сабе[25].

Канцэпцыя «homo militans» – чалавека-ваяра, ў азначаны перыяд пашыраецца і пачынае азначаць чалавека, які змагаецца не толькі са знешнімі ворагамі Айчыны і рэлігіі, але і з унутранымі ворагамі – грахамі і спакусамі.

Акрамя вайсковай дзейнасці прапагандавалася агульная актыўнасць. Каталіцкія прапаведнікі лічылі, што бяздзейнасць – маці ўсіх заган. Бяздзейны чалавек становіцца лёгкай здабычай для д'ябла. Святары заклікалі займаць думкі або чытаннем ці малітвай, або нейкай працай, каб чорт заўсёды заставаў іх пры справе[26]. Павел Сангушка (пам. 1750) 26 гадоў быў на каралеўскай службе, за час якой прысутнічаў на ўсіх соймах, дзе ўз'ядноўваў апанентаў, з-за чаго быў знаным медыятарам. Галоўнай яго турботай былі дзяржаўныя справы, а свае інтарэсы ён адсоўваў на задні план, таму за ўвесь час атрымаў толькі адно староства[27]. Пры пахаванні Крыштафа Мікалая Сапегі (пам. 1631) падкрэслівалася, што нягледзячы на яго малады ўзрост, ён, дзякуючы сваёй руплівай працы і добрай адукацыі, хутка прасоўваўся па кар'ернай лесвіцы – спачатку стаў вялікім літоўскім падстолім, а потым вышэйшым пісарам. Акрамя таго, ён актыўна ўдзельнічаў у парламенцкім і судовым жыцці краіны[28].

Наступным важным момантам, які часта адзначаўся святарамі, была адукаванасць, пры гэтым асабліва падрэслівалася вартасць навучання за межамі Рэчы Паспалітай. Напрыклад, Астафей Валовіч (пам. 1587/88) займаўся навукамі ў італьянскіх і нямецкіх землях, а пасля атрымаў практычныя веды і неабходны досвед пры двары караля [7, с. 236]. Павел Сангушка атрымаў добрую адукацыю ў езуіцкім калегіуме, дзякуючы якой не заразіўся ніякай навамоднай рэлігійнай заразай падчас вандроўкі па Еўропе[29]. Адам Раус выхваляў добрую адукацыю Януша Радзівіла (пам. 1620) і заўважаў, што князь ведаў 5 іншаземных моў, у ходзе сваёй вандроўкі па Еўропе здолеў засвоіць розныя сістэмы навучання, фартыфікацыі, звычаі і рэлігіі[30]. Крыштаф Радзівіл (пам. 1640) быў высокаадукаваным, ведаў лаціну, грэцкую, прагнуў да кніжак і цікавіўся гісторыяй і палітыкай[31]. Варта адзначыць, якія веды па гісторыі мог мець адукаваны шляхціц у Рэчы Паспалітай. Падобнага кшталту дадзеныя знаходзім у казанні, прысвечаным мазырскаму старосце Гераніму Хадкевічу (пам. 1650): «Ведаў адкуль пачатак рымская дзяржава ўзяла, якімі шляхамі, чыімі заслугамі да такой велічы прыйшла. Умеў пералічыць, што за правадыры ў Грэцыі былі, дзе і як з іх каторы і з кім ваяваў, якія перамогі здабыў. Не таямніцай яму заможнасць персідскіх манархаў была, хто па якім манарху на пасад узыходзіў, хто Вавілон заснаваў, дзе Троя стаяла, як доўга за яе грэкі з Прыямам і траянскімі князямі змагаліся» [3, с. 298]. Сын Льва Сапегі, Крыштаф (пам. 1631), пражыў зусім нядоўгае жыццё, таму тэма навучання стала адной з вядучых у пахавальным казанні, створаным Я. Альшэўскім. Прапаведнік адзначаў, што Крыштаф атрымліваў веды ў Віленскай акадэміі, Інгальштацкай акадэміі (вывучаў там красамоўства, гісторыю,

---

[23] Czarliński, B. Kazanie na pogrzebie jaśnie wielmożnego pana Jana Karola Chodkiewicza, Hrabie ze Szkłowa i Myszy, na Bychowie, Wojewody Wileńskiego, Korony Polskiej przeciw Osman Sułtanowi, a W. X. L., Hetmana Najwyższego, Gubernatora Ziemie Inflantskiej, Derpskiego, Luboszańskiego, Wielońskiego etc. etc. Starosty. Miane w Ostrogu w Kościele Farskim / B. Czarliński. – Wilno : Druk. Akademicka, 1622. – Ark. 29–34.

[24] AGAD – F. 354. Archiwum Radziwillow. – Dział II.–13. – Ark. 314

[25] Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy : funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice : Wyd. uniw. Śląskiego, 2012. – S. 67.

[26] Morawski, J. Duchowna Theologia abo Kościół Ducha Ś. to jest człowiek doskonały. Z nauki Pisma Świętego i Ojców Świętych opisany / J. Morawski. – Poznań : Druk. J. K. M. Kollegium Poznańskiego Soc. Jesu, 1717. – S. 56.

[27] Wołłowicz, A. Droga Do Niesmiertelnosci, Publicznych Cnot torem [...] Xiązęcia JMCI Pawla Karola [...] Lubartowicza Sanguszka, [...] Znaczna : Przy Pogrzebowym Akcie w Kościele Lubelskim WW. OO. Kapucynow, wszystkim do naśladowania Pokazana / A. Wołłowicz. – Lublin : Druk. Jezuitów, 1751. – Ark. 52 – 54obr.

[28] Olszewski, J. Grono winne pod zodyakiem Sapieżyńskim w młodem wieku doyrzałey cnoty na pogrzebie [...] Krysztofa Sapiehi woiewodzica wileńskiego [...] w kościele S. Michała panien zakonnych s. Klary [...] 27 Nouemb. [...] 1631 / J. Olszewski. – Wilno : Druk. Akademicka, 1632. – Ark. E4 – E4obr.

[29] Wołłowicz, A. Droga Do Niesmiertelnosci, Publicznych Cnot torem [...] Xiązęcia JMCI Pawla Karola [...] Lubartowicza Sanguszka, [...] Znaczna : Przy Pogrzebowym Akcie w Kościele Lubelskim WW. OO. Kapucynow, wszystkim do naśladowania Pokazana / A. Wołłowicz. – Lublin : Druk. Jezuitów, 1751. – Ark. 51.

[30] Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy : funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice : Wyd. uniw. Śląskiego, 2012. – S. 42.

[31] Там жа. – S. 64.

філасофію), Лованскай акадэміі (засвоіў там палітычныя веды) [7, с. 237]. Пытанне адукацыі было настолькі важным, што бацькі перад смерцю ў тастаменце адзначалі, што жадаюць, каб дзеці ў наступным атрымалі добрую адукацыю. У іншыя пытанні далейшага жыцця дзяцей яны асабліва не паглыбляліся.

З сярэдзіны XVII ст. модным стала звяртаць увагу на хрысціянскае стаўленне да простых людзей і прыгонных сялян. Некаторыя прапаведнікі лаканічна апісвалі памерлых феадалаў як «мілых і добрых» паноў для падданых. Так, віленскі ваявода Крыштаф Хадкевіч (пам. 1652) характарызаваўся не як ганарлівы пан, але як мілы бацька і амаль што ўлюбёны брат, які ніколі не імкнуўся ўзвысіцца над іншымі [3, с. 277]. Павел Сангушка быў добрым гаспадаром, які ніколі сваіх сялян не закоўваў у кайданы, не забіраў іх маёмасць сілай і не рабаваў іх[32]. Князь Крыштаф Радзівіл Пярун (пам. 1603) апісваецца як добры ўладца, які апекаваўся сваімі падначаленымі і добра спраўляўся з тэрыторыямі, якія засталіся яму пасля бацькі[33].

Такім чынам, шляхціц мусіў аб'ядноўць у сабе значную колькасць разнастайных роляў.

У выпадку з этасам шляхцянкі ўсё было крыху прасцей. Муж у раннемадэрновай Рэчы Паспалітай належыў да публічнай сферы, а жонка мусіла ўтрымліваць у парадку хату і забясвечваць дабрабыт. Па гэтай прычыне жанчына павінна была ўвасабляць тры іпастасі – маці, жонка і хрысціянка; такім чынам яна нібы ажыццяўляла повязь зямнога свету і нябеснага[34]. Жанчына разглядалася як слабы элемент, які стаяў у цені мужа і падпарадкоўваўся яму. Любыя гонар і прызнанне, якія яна атрымлівала, былі не вынікам яе асабістых намаганняў, а дасягаліся яе продкамі і мужам. Сярод галоўных якасцей жанчыны звычайна адзначалі чысціню, сціпласць, паслухмянасць, падпарадкаванне, працавітасць, лагоднасць, адданасць.

Зазіраючы ў гісторыю царквы мы знаходзім там дастаткова негатыўнае стаўленне да жанчын – гэта менавіта «дзякуючы» Еве чалавецтва было пазбаўлена божага блаславення і асуджана на зямныя пакуты. Жанчына лічылася грэшнай істотай, недасканалай, немудрай і фальшывай. Галоўнае, чым яна магла выкупіць недасканаласць сваёй прыроды, было нараджэнне дзяцей. Дадатковымі занятками жанчыны былі вядзенне гаспадаркі і выкананне абавязкаў добрай і пакорлівай жонкі. Паступова, дзякуючы сярэднявечнай літаратуры і вобразу дам у народнай культуры стаўленне да жаночага полу паляпшаецца, але месца роўнага мужчыне жанчыны не атрымалі.

Як і датычна шляхціца, галоўнай характарыстыкай шляхцянкі была набожнасць, якая праяўлялася ў дзвюх формах: асабістых рэлігійных практыках і дабрачыннай дзейнасці. Жанчыны вымушаны былі ўдзельнічаць ва ўсіх відах рэлігійных практык, прытрымлівацца пастоў, звяртацца да частай споведзі, прычашчацца, удзельнічаць у набажэнствах, пілігрымках, чытаць набожныя кнігі, рыхтавацца да смерці па парадніках «Ars bene moriendi». Абавязкова адзначалася агульная прыхільнасць і любоў да Бога. Матэрыяльнай праявай іх веры станавілася апека над манахамі і святарамі, заснаванне мясцовых цэркваў і манастыроў, акрамя традыцыйнай ялмужны, яны наведвалі шпіталі, даглядалі за хворымі, аказвалі падтрымку зняволеным і людзям, асуджаным на смерць, бедным студэнтам або скалечаным людзям, састарэлым і дзецям-сіротам. Жанчыны даравалі цэрквам чары, дарахранільні, дарагія лямпы і дарагія матэрыі, але яны не маглі перадаць зямельных надзелаў.

Упіцкая старасціна Рэгіна Валовічаўна Астаф'ева Курчовая (пам. 1631) у стабільнасці сваёй веры была быццам калона. Знешняй праявай дадзенай характарыстыкі ў яе былі фундацыі і падараванні кляштару францысканцаў, раздача міласціны – «заўсёды мела адкрытую далонь для ўбогіх»[35]. Смерць Соф'і Слуцкай (пам. 1612) мусілі аплакваць усе, бо яна была сапраўды дабрадзейнай: шмат малілася, трымала цела і душу ў пакоры Богу, накіроўвала значныя сілы на падтрыманне праваслаўных святынь[36].

Як і ў мужчын асабліва адзначаўся пераход у новую, «правільную» канфесію. Альжбэта з Шыдлоўскіх Радзівіл (пам. 1562), якой першай прысвяцілі пахавальнае казанне, перайшла з каталіцтва ў кальвінізм, пры тым зрабіла гэта па ўласнай волі, што падкрэслівае Ц. Базілік: «Сведка Бог: не з намеру ўласнага рабіла // I не з мужавай волі веру палюбіла, // Але з Божага Слова тое ўсё ўвабрала». Акрамя таго, адзначаецца талерантная і верацярпімая пазіцыя княжны [8, с. 323–324]. Зваротная сітуацыя ўсхвалялася ў казанні, зробленым на пахаванні Марыны Абрынскай, якая нарадзілася пратэстанткай, але потым перайшла ва ўніяцтва. Яна шмат малілася і наведвала службы ў касцёлах, прытрымлівалася пастоў і дапамагала ўбогім [6, с. 42].

Асноўнае да чаго заклікалі жанчын – гэта канцэнтравацца на духоўным свеце, і на ўнутранай прыгажосці, а не на знешняй. Адбывалася ганьбаванне выкарыстання касметыкі і іншых мадыфікацый. Рэзка крытыкавалася ўкладка і афарбоўванне валасоў, бо святары лічылі, што гэтыя дзеянні не толькі марнуюць час, але і абражаюць

---

[32] Wołłowicz, A. Droga Do Niesmiertelnosci, Publicznych Cnot torem [...] Xiążęcia JMCI Pawla Karola [...] Lubartowicza Sanguszka, [...] Znaczna : Przy Pogrzebowym Akcie w Kościele Lubelskim WW. OO. Kapucynow, wszystkim do naśladowania Pokazana / A. Wołłowicz. – Lublin : Druk. Jezuitów, 1751. – Ark. 57.

[33] Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy : funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice : Wyd. uniw. Śląskiego, 2012. – S. 30.

[34] Nowicka-Jeżowa, A. Pieśni czasu śmierci : studium z historii duchowości XVI–XVIII wieku / A. Nowicka-Jeżowa. – Lublin : Towarzystwo Nauk. Katolickiego Uniw. Lubelskiego, 1992. – S. 90–91.

[35] Korona, M. Kazanie xiędza Marka Korony Pisma Swietego doktora [...] na pogrzebie [...] Reginy Wołłowiczowny, Ostaphiowey Kurczowey, starościney upitskiey, w Grodnie, w kościele oycow bernardinów, dnia 11 lutego, roku 1631 / M. Korona. – [B/m], [1631]. – Ark. 15–16.

[36] Naborowski, D. Poezje / D. Naborowski, oprac. J. Dürr-Durski. – Warszawa : PIW, 1961. – S. 77.

Творцу. Маральнае зло неслі ў сабе і разнастайныя ўпрыгажэнні, асабліва ювелірныя вырабы: прапаведнікі тлумачылі, што каштоўнасці пераўтвараюцца ў нішто ў труне[37].

Наступнай значнай роляй у жыцці жанчыны было мацярынства, але яму не прысвячалася шмат месца. Аўтары казанняў зазвычай проста адзначалі, што жанчына мела нейкую колькасць дзяцей, якіх яна выхавала ў любові і пакоры да Бога і якія сталі, ці яшчэ стануць, годнымі чальцамі грамадства. Плоднасць жанчыны была знакам яе вартасці, абранасці і благаславення Божага. Акрамя таго, высокая плоднасць ва ўмовах высокай дзіцячай смяротнасці давала надзею на працягванне роду, таму надзвычайна цанілася ў грамадстве[38]. Значным фактам з'яўлялася нараджэнне хлопца – гэты акт вызваляў жанчыну ад першароднага граху.

Апошняя, але не менш значная, роля жанчыны – гэта жонка. Соф'я Слуцкая ў прысвечаным ёй казанні была прадстаўлена як прыклад добрай жонкі, што заўсёды ўтрымлівала вернасць мужу[39]. У Саламона Рысінскага яна фігуруе як адданейшая з кабет свайго часу, але жаль па смерці княжны павялічваецца, бо яна не пакінула мужу нашчадкаў[40]. У шлюбе была вернай і Рэгіна Валовічаўна Астаф'ева Курчовая[41]. Пераўзыходзіла ўсіх пакорай, чысцінёй і сціпласцю, а таксама вернасцю мужу Альжбэта з Шыдлоўскіх Радзівіл. Яна, як і старазапаветная Сара, была дадзена ў дапамогу свайму мужу[42]. Акрамя вернасці ў шлюбе царквой высока цанілася захаванне вернасці і пасля смерці мужа. Напрыклад, М. Абрынская пасля смерці мужа, калі ёй было 66 гадоў, не пайшла ў наступны шлюб, а, як тое патрабавалася ад сапраўднай хрысціянкі царквой, прысвяціла сябе Богу – малілася і прытрымлівалася пастоў [6, с. 43].

Адукацыя і грамадская дзейнасць у пахавальных казаннях жанчын не фігуруюць. Радзей, чым у мужчын, адзначаецца добрае стаўленне да сялян. Так, Альжбэта Радзівіл была абаронцам сірот і добрай пані для ўсіх сваіх падданых[43] [8, с. 330].

**Заключэнне.** Такім чынам, у выніку нашага даследавання мы прыйшлі да наступных высноў.

Пахавальныя казанні з'явіліся яшчэ ў старажытнай Грэцыі і былі своеасаблівым дарам памерламу, дзякуючы якому ён навечна заставаўся ў свецe жывых. У часы Рэфармацыі і Контррэфармацыі дадзены жанр атрымаў новы штуршок да развіцця. Пры яго дапамозе адбываецца распаўсюджванне адпаведных дагматычных ідэй, яго выкарыстоўваюць у рэлігійнай палеміцы, фарміруюць вобраз чалавека, які праз годнае жыццё на зямлі можа дасягнуць вечнага жыцця на нябёсах.

На аснове пахавальных казанняў і пропаведзяў у грамадстве фарміраваўся вобраз годных шляхціца і шляхцянкі. Найбольш разгалінаваным і шматбаковым быў вобраз шляхціца. Ён мусіў аб'ядноўваць у сабе цэлы шэраг іпастасяў. Перш за ўсё гэта была роля хрысціянскага рыцара-сармата, які верыць у Бога, даказвае сваю веру праз індывідуальныя рэлігійныя практыкі (малітвы, пасты, пілігрымкі, утаймаванне плоці, харытатыўную дзейнасць) і мецэнацкую дзейнасць, і, што не менш важна, адстойвае сваю рэлігію ў змаганнях з іншаверцамі. Акрамя супрацьстаяння знешнім ворагам, сармат мусіў змагацца і з унутранымі – грахамі і спакусамі. Наступная роля – гэта актыўны ўдзельнік грамадскага жыцця, які адстойвае свае ідэі і інтарэсы на соймах, прымае ўдзел у разборы судовых спраў у земскіх і гродскіх судах, імкнецца да прасоўвання па кар'ернай лесвіцы. Для забеспячэння ўсіх гэтых актыўнасцей шляхціц мусіў мець добрую адукацыю, якую ён атрымліваў спачатку ў межах Рэчы Паспалітай, а пасля выпраўляўся ў адукацыйную вандроўку, з дапамогай якой мог пашырыць свой кругагляд і засвоіць усе апошнія дасягненні ў фартыфікацыі, палітыцы і праве. Не апошняй была роля добрага гаспадара-земяніна і галавы сям'і, які імкнецца забяспечыць усім добры ўзровень жыцця і абараняе сваіх падданых.

Жанчына, па прычыне таго, што не ўваходзіла ў сферу публічнасці, мусіла канцэнтравацца на доме і рэлігійных практыках – ёй належала быць набожнай хрысціянкай, падтрымліваць маральна і матэрыяльна сваю канфесію, у адпаведных традыцыях выхоўваць дзяцей, быць апорай для мужа. У выпадку смерці апошняга яна, канешне, магла пабрацца новым шлюбам, але ў ідэале яна мусіла сканцэнтравацца на духоўных практыках і рыхтавацца да ўласнай смерці.

З асаблівасцей светапогляду каталікаў і пратэстантаў можна адзначыць прыхільнае стаўленне апошніх да верацярпімасці і працы над дасягненнем роўнасці ўсіх канфесій у Рэчы Паспалітай, у той час як каталікі імкнуліся да поўнай гегемоніі ў рэлігійным жыцці.

---

[37] Krzysztofik, M. XVII-wieczny model antropologii ciała / M. Krzysztofik // Studia wschodniosłowiańskie. – 2013. – T. 13. – S. 253–256.

[38] Bogucka, M. Białogłowa w dawnej Polsce : kobieta w społeczeństwie polskim XVI–XVIII wieku na tle porównawczym / M. Bogucka. – Warszawa : Trio, 1998. – S. 55–59.

[39] Naborowski, D. Poezje / D. Naborowski, oprac. J. Dürr-Durski. – Warszawa : PIW, 1961. – S. 79.

[40] Jarczykowa, M. Przy pogrzebach rzeczy i rytmy : funeralia Radziwiłłowskie z XVII wieku / M. Jarczykowa. – Katowice : Wyd. uniw. Śląskiego, 2012. – S. 92.

[41] Korona, M. Kazanie xiędza Marka Korony Pisma Swietego doktora [...] na pogrzebie [...] Reginy Wołłowiczowny, Ostaphiowey Kurczowey, starościney upitskiey, w Grodnie, w kościele oycow bernardinów, dnia 11 lutego, roku 1631 / M. Korona. – [B/m], [1631]. – Ark. 19.

[42] Karpluk, M. O nieuwiarowaniu śmierci – rękopiśmienna relacja świadka ostatnich dni Elżbiety z Szydłowieckich Radziwiłłowej / M. Karpluk, J. Pirożyński // Miscellanea Staropolskie. – 1990. – T. 6. – S. 81.

[43] Там жа.

Напрыканцы трэба падкрэсліць, што сваю папулярнасць і ўплывовасць пахавальныя казанні атрымалі сярод шляхты таму, што ўтрымлівалі ў сабе не проста абстрактныя ідэальныя вобразы, але паказвалі іх на прыкладзе жыцця канкрэтнай асобы. Безумоўна, нельга адмаўляць, што ўплыў быў узаемны – не толькі казанні фарміравалі грамадскія ўсталёўкі, але і грамадства фарміравала тыя вобразы, якія адлюстроўваліся ў казаннях. Менавіта па гэтай прычыне яны былі папулярныя ў Рэчы Паспалітай, а сёння з'яўляюцца добрым матэрыялам для вывучэння ментальнасці шляхты.

## ЛІТАРАТУРА


1. Корзо, М.А. Образ человека в проповеди XVII в. / М.А. Корзо. – М. : Изд-во ин-та философии РАН, 1999. – 189 с.
2. Лескинен, М.В. Мифы и образы сарматизма: Истоки нац. идеологии Речи Посполитой / М.В. Лескинен. – М., 2002. – 178 с.
3. Косман, М. Пахавальныя казанні / М. Косман // З гісторыі культуры Вялікага Княства Літоўскага / уклад. Г. Сагановіч, пер. з пол.: С. Ішчанка [і інш.]. – Мінск, 2010. – С. 252–302.
4. Сліж, Н.У. Гендэрна-ролевыя функцыі шляхціца ў сям'і і грамадстве Вялікага княства Літоўскага / Н.У. Сліж // Соціум. Альманах соціальної історії. – Київ, 2005. – Вип. 5. – С. 165–184.
5. Сліж, Н.У. Гендэрная ідэнтыфікацыя шляхціча або што такое быць сапраўдным мужчынам у ВКЛ у XVI–XVII ст. / Н.У. Сліж // Канструкцыя і дэканструкцыя Вялікага Княства Літоўскага : матэрыялы міжнар. навук. канф., Гродна, 23–25 крас. 2004 г. / Гродзенскае абласное грамадскае аб'яднанне маладых навукоўцаў "ВІТ" ; пад рэд. Н. У. Сліж. – Мінск, 2007. – С. 135–142.
6. Сліж, Н.У. Ідэальныя палачанкі / Н.У. Сліж // Commentarii Polocenses Historici. – Полацк, 2006. – Т. 3. – С. 42–44.
7. Сцебурака, А.М. Пахавальныя казанні як крыніца па гісторыі адукацыі ў Вялікім Княстве Літоўскім / А.М. Сцебурака // Статут Вялікага Княства Літоўскага ў гісторыі культуры Беларусі : матэрыялы IX Міжнар. кнігазн. чытанняў, Мінск, 18–19 крас. 2013 г. / склад.: Т.А. Сапега, А.А. Суша. – Мінск, 2013. – С. 234–238.
8. Базылік, Ц. Кароткае апісанне смерці і пахавання асвечанай княгіні пані Альжбэты Радзівіл з Шыдлоўца, жонкі віленскага ваяводы году 1562 / Ц. Базілік // Літаратура XI–XVI стагоддзяў / навук. рэд. В.А. Чамярыцкі. – Мінск, 2011. – С. 317–335.


## REFERENCES


1. Korzo, M.A. (1999). *Obraz cheloveka v propovedi XVII v.* Moscow: Izdatel'stvo instituta filosofii RAN. (In Russ.).
2. Leskinen, M.V. (2002). *Mify i obrazy sarmatizma: Istoki nacional'noj ideologii Rechi Pospolitoj*. Moscow. (In Russ.).
3. Kosman, M. (2010). Pahaval'nyya kazanni. In Saganovich, G.(Eds.) *Z gistoryi kul'tury Vyalikaga Knyastva Litoўskaga*. (252–302). Minsk. (In Beloruss.).
4. Slizh, N.U. (2005). Genderna-rolevyya funkcyi shlyahcica u syam'i i gramadstve Vyalikaga knyastva Litoўskaga. *Socium. Al'manah social'noї istoriї.* (Iss. 5., 165–184) Kiev. (In Beloruss.).
5. Slizh, N.U. (2007). Gendernaya identyfikacyya shlyahcicha abo shto takoe byc' sapraўdnym muzhchynam u VKL u XVI–XVII st. In Slizh, N.U. (Eds.) *Kanstrukcyya i dekanstrukcyya Vyalikaga Knyastva Litouskaga*. (135–142). Minsk. (In Beloruss.).
6. Slizh, N.U. (2006). Ideal'nyya palachanki. *Commentarii Polocenses Historici.* (Vol. 3.), 42–44. (In Beloruss.).
7. Sceburaka, A.M. (2013). Pahaval'nyya kazanni yak krynica pa gistoryi adukacyi u Vyalikim Knyastve Litoўskim. In Sapega, T.A. & Susha, A.A. *Statut Vyalikaga Knyastva Litoўskaga ў gistoryi kul'tury Belarusi.* (234–238). Minsk. (In Beloruss.).
8. Bazylik, C. (2011). Karotkae apisanne smerci i pahavannya asvechanaj knyagini pani Al'zhbety Radzivil z SHydlouca, zhonki vilenskaga vayavody godu 1562. In Chamyarycki, V.A. (Eds.) *Litaratura XI–XVI stagoddzyau.* (317–335). Minsk. (In Beloruss.).


*Пастуліў 15.09.2021*

## ЭТОС ШЛЯХТИЧА И ШЛЯХТЯНКИ В ПОХОРОННЫХ ПРОПОВЕДЯХ РЕЧИ ПОСПОЛИТОЙ XVI–XVIII ВВ.

***Н.В. СТАХНО***

*В статье сделана попытка реконструировать этос шляхтича и шляхтянки, который формировался христианскими проповедниками на территории Речи Посполитой в эпоху барокко. Реконструкция основана на анализе похоронных проповедей, которые в этот период стали чрезвычайно популярными. Отмечены сформировавшиеся на их основе морально-этические нормы шляхтича-мужчины и женщины-шляхтянки, проведено сопоставление образов шляхтича-католика и шляхтича-протестанта, выявлены конфессиональные особенности этоса. Кроме того, выстраивается иерархия ценностей, которые транслировались церковью как достойные для восприятия. Выявлены особенности ценностной иерархии шляхтича в соотнесении его образа с образом шляхтянки, сформирована система ролей, характерных для привилегированного слоя населения Речи Посполитой.*

***Ключевые слова:*** *шляхетская культура, танатология, этос, Реч Посполитая, похоронные проповеди XVI–XVIII вв.*

**THE NOBLEMENS' AND THE NOBELWOMENS' ETHOS IN THE FUNERAL SERMONS OF THE SPEECH OF THE POLISH-LITHUANIAN COMMONWEALTH XVI–XVIII CENTURIES**

***N. STAKHNO***

*The paper attempts to reconstruct the ethos of a nobleman and a noblewoman, which were formed by Christian preachers in the territory of the Polish-Lithuanian Commonwealth in the Baroque era. Reconstruction is based on the analysis of funeral sermons, which became extremely popular during this period. Those moral and ethical standards of the nobleman-man and the woman-noblewoman which were formed on their basis are noted, the comparison of images of the nobleman-Catholic and the nobleman-Protestant is carried out, confessional features of ethos are found out. In addition, a hierarchy of values that are transmitted by the church as worthy of perception is built. The peculiarities of the value hierarchy of the nobleman in relation to the image of the noblewoman are found out. The system of roles characteristic of a privileged layer of the population of the Commonwealth is developed.*

***Keywords:*** *nobility culture; thanatology; ethos; Polish-Lithuanian Commonwealth; funeral sermons XVI – XVIII century.*